# Выкарыстанне лексічнага матэрыялу з твораў Уладзіміра Караткевіча для падрыхтоўкі да алімпіяды па беларускай мове і літаратуры ў 9-11 класах

**Таццяна Андрэеўна Троцкая,**
настаўніца беларускай мовы і літаратуры
вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі
Арэхаўскай сярэдняй школы імя Ю.В. Смірнова Аршанскага раёна

***Дадзены матэрыял, падрыхтаваны на аснове лексікі з твораў Уладзіміра Караткевіча, можна выкарыстаць для падрыхтоўкі да алімпіяды па беларускай мове і літаратуры. Усе прапанаваныя словы ўзяты з праграмных твораў пісьменніка, якія вывучаюцца ў 5-11 класах.***

Фарміраванне трывалых ведаў у старшых класах патрабуе не толькі засваення тэарэтычных пастулатаў, але і моўнай інтуіцыі, умення аналізаваць і інтэрпрэтаваць мастацкія тэксты. Алімпіяда па беларускай мове і літаратуры – гэта выпрабаванне, якое аб’ядноўвае ўсе гэтыя навыкі. У гэтым кантэксце асаблівую каштоўнасць мае лексічны матэрыял з твораў Уладзіміра Караткевіча – аднаго з найвыдатнейшых пісьменнікаў Беларусі XX стагоддзя. Выкарыстанне лексікі Караткевіча ў падрыхтоўцы да алімпіяды дазваляе развіць навыкі аналізу і ўзбагаціць маўленне навучэнцаў.

Для выкарыстання лексічнага матэрыялу для алімпіядных заданняў па беларускай мове прапануецца знайсці адпаведнасць паміж словамі і іх значэннямі на прапанаваных картках.

**Картка № 1**

| | |
|---|---|
| 1. Дынастыя | 1. Халоднае памяшканне пры хаце для захоўвання запасаў ежы, адзення і іншых хатніх рэчаў |
| 2. Анімаліст | 2. Белая паласа вакол шыі |
| 3. Ажаролак | 3. Прыстасаванне для прывязвання, падымання грузаў, перадачы руху і іншых мэт, якое складаецца з металічных звёнаў, паслядоўна счэпленых адно з другім |
| 4. Патрыярх | 4. Невялікая ліса з вялікімі вушамі |
| 5. Ланцуг | 5. Невялікая надбудова над сярэдняй часткай дома |
| 6. Камора | 6. Пачынальнік роду |
| 7. Мезанін | 7. Некалькі пакаленняў, якія з роду ў род наследуюць адну і тую ж прафесію ці занятак |

ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА

| | |
|---|---|
| 8. Фенек | 8. Мастак або скульптар, які паказвае ў сваіх творах пераважна жывёл |

**Картка № 2**

| | |
|---|---|
| 1. Нукер | 1. Рэшткі разбуранага збудавання, паселішча |
| 2. Аркан | 2. Невялікая пабудова ў глухой мясцовасці для адзінокіх манахаў-пустэльнікаў, аддаленая ад чалавечага паселішча |
| 3. Пустэльнік | 3. Дружыннік, воін уласнай аховы хана |
| 4. Руіны | 4. Частка збруі, якая надзяваецца каню на галаву |
| 5. Шэлег | 5. Чалавек, які з рэлігійных меркаванняў адмовіўся ад зносін з людзьмі і пасяліўся ў бязлюдным месцы |
| 6. Цёмнік | 6. Дробная манета |
| 7. Аброць | 7. Доўгая вяроўка з рухомай пятлёй на канцы для лоўлі коней і іншай жывёлы |
| 8. Скіт | 8. Кіраўнік дзесяцітысячнага войска |

**Картка № 3**

| | |
|---|---|
| 1. Кубел | 1. Страва са свежай рыбы з прыправамі |
| 2. Талака | 2. Печ у лазні, складзеная з камення |
| 3. Каменка | 3. Дзежка з вушкамі і векам для захавання прадуктаў і рэчаў |
| 4. Юшка | 4. Салодкая ячменная каша, якую ядуць перад Калядамі і Новым годам; на памінках |
| 5. Цэбар | 5. Скрыня з векам на завесах і замком, якая служыць для захоўвання адзення |
| 6. Поліўка | 6. Калектыўная дапамога ў гаспадарчых работах |
| 7. Куцця | 7. Шырокая круглая драўляная пасудзіна з клёпак з двума вушкамі |
| 8. Куфар | 8. Тлусты гарачы суп, падбоўтаны мукой |

**Картка № 4**

| | |
|---|---|
| 1. Віціна | 1. Паўстанец |
| 2. Старык | 2. Зручны выпадак для якой-небудзь справы |
| 3. Улан | 3. Старое перасохлае рэчышча |
| 4. Інсургент | 4. Салдат або афіцэр коннай арміі |
| 5. Аказія | 5. Каравульнае памяшканне |
| 6. Фельд’егер | 6. Паляўнічая сумка для дзічыны |

| | |
|---|---|
| 7. Абвахта | 7. Крытае судна для перавозкі збожжа |
| 8. Ягташ | 8. Ваенны кур’ер |

**Картка № 5**

| | |
|---|---|
| 1. Палац | 1. Падвода для перавозкі грузаў |
| 2. Дрыкганты | 2. Штосьці нерэальнае, падманнае; здань |
| 3. Лемпарт | 3. Вялікі, раскошны, багаты будынак |
| 4. Маярат | 4. Паядынак паміж дзвюма асобамі з выкарыстаннем зброі |
| 5. Прывід | 5. Жанчына, якая вядзе хатнюю гаспадарку ў багатым доме; аканомка |
| 6. Дуэль | 6. Нерухомая маёмасць, на якую пашыраецца парадак атрымання спадчыны, пры якім зямельнае ўладанне пераходзіць старэйшаму сыну або старэйшаму ў родзе |
| 7. Ахмістрыня | 7. Вымерлая беларуска-польская парода коней |
| 8. Фурманка | 8. Балотная рысь |

**Картка № 6**

| | |
|---|---|
| 1. Ларнік | 1. Каталіцкі епіскап |
| 2. Мытнік | 2. Пляскатая табакерка для табакі |
| 3. Засценак | 3. Галоўны над архівам |
| 4. Біскуп | 4. Спецыяліст у галіне будаўніцтва; архітэктар |
| 5. Таўлінка | 5. Ганец, вястун, скараход |
| 6. Сыгнет | 6. Тып сельскага паселішча на Беларусі ў XVI–XX стст. |
| 7. Дойлід | 7. Службовая асоба ў ВКЛ, якая збірала пошліну з купцоў за ўвоз і вываз тавараў |
| 8. Цякач | 8. Пярсцёнак з пячаткай (імяннной) |

**Адказы:**

1. 1 – 7; 2 – 8; 3 – 2; 4 – 6; 5 – 3; 6 – 1; 7 – 5; 8 – 4.
2. 1 – 3; 2 – 7; 3 – 5; 4 – 1; 5 – 6; 6 – 8; 7 – 4; 8 – 2.
3. 1 – 3; 2 – 6; 3 – 2; 4 – 1; 5 – 7; 6 – 8; 7 – 4; 8 – 5.
4. 1 – 7; 2 – 3; 3 – 4; 4 – 1; 5 – 2; 6 – 8; 7 – 5; 8 – 6.
5. 1 – 3; 2 – 7; 3 – 8; 4 – 6; 5 – 2; 6 – 4; 7 – 5; 8 – 1.
6. 1 – 3; 2 – 7; 3 – 6; 4 – 1; 5 – 2; 6 – 8; 7 – 4; 8 – 5.

Прапанаваны лексічны матэрыял можна выкарыстаць і для алімпіядных заданняў па беларускай літаратуры. Для гэтага падаецца табліца

з падказкамі па змесце твораў У. Караткевіча для вызначэння іх назваў і падбору лексічнага матэрыялу адпаведна названым творам.

| Падказкі | Назва твора | № карткі з лексічным матэрыялам |
|---|---|---|
| 1. Гэта этнаграфічны твор, у якім расказваецца пра нашу Радзіму | | |
| 2. Жонка паўстанца вязе дакумент аб памілаванні мужа і спазняецца на дзесяць хвілін | | |
| 3. Сюжэт твора заснаваны на легендзе пра радавое пракляцце | | |
| 4. Маленькая жывёла велічынёй з рукавічку ператварылася ў вялізнага мядзведзя | | |
| 5. Падзеі твора, якія адбываліся больш за чатырыста гадоў назад, пераклікаюцца з падзеямі Вялікай Айчыннай вайны | | |
| 6. У гэтым творы расказваецца пра дзве версіі ўзнікнення назвы «Белая Русь» | | |

**Адказы:**

| Падказкі | Назва твора | № карткі з лексічным матэрыялам |
|---|---|---|
| 1. Этнаграфічны твор, у якім расказваецца пра нашу Радзіму | «Зямля пад белымі крыламі» | 3 |
| 2. Жонка паўстанца вязе дакумент аб памілаванні мужа і спазняецца на дзесяць хвілін | «Паром на бурнай рацэ» | 4 |
| 3. Сюжэт твора заснаваны на легендзе пра радавое пракляцце | «Дзікае паляванне караля Стаха» | 5 |
| 4. Маленькая жывёла велічынёй з рукавічку ператварылася ў вялізнага мядзведзя | «Былі ўмяне мядзведзі» | 1 |

| | | |
|---|---|---|
| 5. Падзеі твора, якія адбываліся чатырыста гадоў назад, пераклікаюцца з падзеямі Вялікай Айчыннай вайны | «Чорны замак Альшанскі» | 6 |
| 6. У гэтым творы расказваецца пра дзве версіі ўзнікнення назвы «Белая Русь» | «Лебядзіны скіт» | 2 |

Лексічны матэрыял з твораў Уладзіміра Караткевіча – гэта не толькі мастацкая каштоўнасць, але і эфектыўны інструмент для развіцця моўных і літаратурных кампетэнцый навучэнцаў. Яго выкарыстанне ў падрыхтоўцы да алімпіяды дазваляе навучэнцам авалодаць багатай беларускай лексікай, адчуць дух часу, у якім жылі героі твораў пісьменніка, узбагаціць веды па прадмеце, развіваць аналітычныя навыкі, неабходныя для паспяховага ўдзелу ў алімпіядах.

**Спіс літаратуры**

1. Караткевіч, У. Збор твораў : У 25 т. / У. Караткевіч. – Мн. : Маст. літ., 2013.

2. Баханькоў, А. Я. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы / А. Я. Баханькоў, І. М. Гайдукевіч, П. П. Шуба. – Мн. : Парадокс, 1998. – 414 с.

ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА